

НА ЎШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ

# Ежы Гедройца

НА ЎШАНАВАННЕ
ПАМЯЦІ

# *Ежы Гедройца*

Матэрыялы Міжнароднай
навуковай канферэнцыі
**«Канцэпцыя УЛБ**
(Украіна, Літва, Беларусь) —
ад ідэі да рэалізацыі»
(Мінск, 8–10 чэрвеня 2006 г.);
выбраныя артыкулы
з перыядычнага друку

Мінск
«Кнігазбор»
2006

*Аляксандр Вабішчэвіч (Брэст, Беларусь)*

# Традыцыі ВКЛ у заходнебеларускіх гісторыка-культуралагічных даследаваннях 20–30-х гадоў XX стагоддзя [*]

Хоць у апошні час асоба Е. Гедройца і яго творчая спадчына выклікаюць вялікую цікавасць як у айчынных, так і замежных даследчыкаў, аднак многія перыяды яго жыцця застаюцца пакуль невывучанымі. Адзін з іх — міжваенны час, калі ў межах Польскай дзяржавы адбывалася яго вучоба ў Варшаўскім універсітэце, фарміраванне яго светапогляду, разгортванне грамадскай актыўнасці, пачалася кар'ера чыноўніка, праявіліся рэдактарскія здольнасці. Цяперашнім і будучым даследчыкам жыцця і творчасці Е. Гедройца яшчэ трэба будзе сур'ёзна вывучыць указаныя аспекты. У сваю чаргу, паспрабуем засярodзіць увагу на іншай праблеме — адлюстраванні традыцый ВКЛ, апошнім грамадзянінам якога з'яўляўся Мысліцель, у заходнебеларускіх гісторыка-культуралагічных даследаваннях таго часу.

Для II Польскай рэспублікі, якая па складу насельніцтва была шматнацыянальнай і па ладу унітарнай дзяржавай, надзённай з'яўлялася нацыянальная праблема. Палітычная эліта краіны была настроена па-рознаму адносна яе вырашэння. Нацыянальныя дэмакраты (эндэкі), якія вылучалі праграмны лозунг «Польшча для палякаў», выступалі за варыянт гвалтоўнай паланізацыі няпольскага насельніцтва. Кансерватыўныя колы прапаноўвалі больш мяккі, паступовы шлях нацыянальнай асіміляцыі меншасцей. На працягу міжваеннага перыяду паспытала пэўную трансфармацыю канцэпцыя стварэння федэрацыі, асновы якой выкладзены ў асобнай адозве Ю. Пілсудскага

[*] Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў у межах праекта Г05Р – 027.

да жыхароў былога ВКЛ у красавіку 1919 г. Аднак пасля Рыжскага дагавора 1921 г. гэтая канцэпцыя эвалюцыяніравала ў тэорыю «праметэізму», што прадугледжвала шляхам некаторых уступак адцягваць заходнебеларускія і заходнеўкраінскія землі ад арыентацыі на Усход. Варта таксама адзначыць краёўцаў, якія не адмяжоўваліся ад Польшчы, аднак падкрэслівалі адрознасць сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця, сацыяльнай, нацыянальнай, канфесійнай і іншых асаблівасцей тэрыторыі былога ВКЛ.

Урадавая нацыянальная палітыка Польшчы ў 1921–1926 гг. была нестабільнай, у многім абапіралася на сацыяльна-псіхалагічныя фактары, якія выяўляліся ў тагачасным польскім грамадстве. З усталяваннем рэжыму «санацыі» Ю. Пілсудскага актыўна прапагандавалася і ўкаранялася на практыцы дзяржаўная інтэграцыя нацыянальных меншасцей. Нягледзячы на пераход рэжыму «санацыі» ад палітыкі нацыянальнай асіміляцыі да палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі, перыяд адноснага лібералізму быў даволі непрацяглым. 1927 г., калі праводзіўся разгром самай масавай грамадска-палітычнай арганізацыі — Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, паводле А. Хайноўскага, стаў «годам вялікага пералому» ў адносінах да беларускай меншасці. Вырашэнне беларускага пытання было вернута ў рэчышча палітыкі паланізацыі [1].

У тагачасных умовах этнакультурнага жыцця беларуская інтэлігенцыя важнае значэнне надавала распрацоўцы ўласнай гістарыяграфічнай канцэпцыі, папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Беларускім дзеячам неабходна было прапанаваць свой погляд на ўласнае мінулае, зрабіць яго дзейсным фактарам грамадскага жыцця. Традыцыі беларускай дзяржаўнасці эпохі ВКЛ і Рэчы Паспалітай для многіх з іх лічыліся найбольш удалым прыкладам для стварэння міфалагізаваных гістарыяграфічных канструкцый, выпрацоўкі палітычных тэорый. І работа ў напрамку развіцця нацыянальна-дэмакратычнай гістарыяграфіі ажыццяўлялася (асабліва ў 1920-я гг.) ідэолагамі беларусізацыі ў Савецкай Беларусі, дзеячамі палітычнай эміграцыі. У. Ігнатоўскі ў працы «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» (на працягу 1919–1926 гг. выйшлі чатыры яе выданні) ВКЛ паводле нацыянальнага характару прызнаваў літоўска-беларускай дзяржавай. Ён лічыў, што ВКЛ утварылася на аснове сінтэзу дзяржаўных і

[1] Chojnowski A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1979. S. 242.

палітычных структур Полацкай Русі і Літвы [2]. Паводле яго меркаванняў, гэтая літоўска-беларуская дзяржава была пабудавана не столькі дзякуючы ваенным паходам, колькі шляхам згоды, дагавораў.

На падставе прынцыпу дзяржаўнасці і грамадскага стану беларускіх зямель У. Ігнатоўскі вылучаў пяць перыядаў у гісторыі Беларусі. Сярод іх ён называў літоўска-беларускі (XIII – першая палова XVI ст.), калі Беларусь і Літва былі ў складзе ВКЛ, і польскі (другая палова XVI – XVIII ст.) — у складзе Рэчы Паспалітай. У даследаванні У. Ігнатоўскага Люблінская унія ацэнена адмоўна, бо Літва і Беларусь тады былі інкарпараваны і страцілі сваю палітычную і культурную незалежнасць. Польская мова, культура, сацыяльна-палітычны лад, каталіцкае веравызнанне займелі ў Рэчы Паспалітай пануючае становішча. На думку У. Ігнатоўскага, Рэч Паспалітая была не федэратыўнай, а фактычна унітарнай, непадзельнай дзяржавай. «Па Люблінскай уніі Літва і Беларусь злучаюцца з Польшчай у адно цэлае, у адзін дзяржаўны арганізм» [3]. Аўтар разглядаў у геапалітычным кантэксце ўзаемаадносіны ВКЛ з крыжакамі, Польшчай, Маскоўскай дзяржавай. Грунвальдская бітва 1410 г. названа ім пераломным момантам у змаганні з крыжакамі. Паколькі ВКЛ «з самага пачатку свайго існавання ўзяло на сябе заданне сабраць у адзіны палітычны арганізм заходнюю частку рускіх славян», то з-за гэтага з другой паловы XIV ст. пачалі ўскладняцца адносіны з Масквой, што выступіла сапернікам [4]. Канфесійная палітыка ВКЛ адзначана як талерантная, хоць праваслаўныя і мелі менш правоў у параўнанні з каталікамі.

Беларускія гісторыка-культуралагічныя даследаванні на працягу ўсяго міжваеннага перыяду ажыццяўляліся і ў суседняй з Польшчай Літве. В. Ластоўскі ў артыкулах на старонках літаратурна-навуковага часопіса «Крывіч» (выдаваўся ў Коўне ў 1923–1927 гг.) развіваў уласную «крыўскую» тэорыю і канцэпцыю самабытнага гістарычнага шляху беларусаў («Прычыны заняпаду крыўскай мовы ў XVII ст.» і інш.). Брэсцкую унію 1596 г. паказваў у гісторыі ВКЛ як нацыянальна-культурную з'яву. Паводле В. Ластоўскага, уніяцтва магло стаць нацыянальнай рэлігіяй, каб атрымала дзяржаўны статус, захоўвала народную мову і літургію, пры наяўнасці масавай падтрымкі насельніцтва.

---

[2] Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі 5-е выд. Мн., 1991. С. 72.

[3] Тамсама. С. 114.

[4] Тамсама. С. 92.

Ігнат Дварчанін у 1926 г. абараніў у Празе дысертацыю, прысвечаную аналізу дзейнасці і светапогляду Ф. Скарыны («Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай глебе»; апублікавана ў перакладзе з чэшскай мовы ў 1991 г.). У рукапісах засталіся яго працы «Ф. Скарына ў адносінах да працоўнага народа», «З гісторыі друкаваных выданняў аб Скарыне», «Спроба апісання бібліяграфіі аб доктару Францішку Скарыне».

Вялікую цікавасць да айчыннай сярэдневяковай гісторыі праяўлялі самі прадстаўнікі заходнебеларускай творчай і навуковай інтэлігенцыі. Максім Гарэцкі ў «Гісторыі беларускае літаратуры» (Вільня, 1920) даў добры сістэматызаваны, агульнадаступны і адначасова навуковы аналіз тысячагадовага шляху беларускага прыгожага пісьменства. Нягледзячы на літаратуразнаўчы характар працы, аналіз ажыццёўлены на падставе метадаў гістарычнага даследавання. Былі адзначаны станоўчыя ўплывы беларускай дзяржаўнасці ў эпоху ВКЛ на творы пісьменнасці ці літаратуру «залатога веку» (летапісы, Статуты ВКЛ, творы Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, Л. Сапегі і іншых дзеячаў). М. Гарэцкі высока ацэньваў агульны культурны ўзровень усходнеславянскага насельніцтва на момант утварэння ВКЛ. «І літоўскія князі сталі карыстацца ў сваіх канцылярскіх справах нашаю кніжнаю моваю» [5]. Крызіс старабеларускай літаратуры М. Гарэцкі тлумачыў слабасцю яе сацыяльных структур («наш народ быў адсунуты, застаўся ўбаку ад кіраўніцтва сваім гістарычным жыццём»), павярхоўнай «культурнасцю» большасці шляхецкага саслоўя, што арыентавалася на польскія духоўныя і рэлігійныя ўзоры («літоўская арыстакратыя і шляхта гоніцца за польскаю арыстакратыяй і шляхтай») [6]. Сярод негатыўных фактараў адзначаліся таксама страта ВКЛ палітычнай незалежнасці, драматычнае супрацьстаянне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў на беларускіх землях. «З 2-й паловы 17 ст. наша мова пачынае траціць месца ў навуцы, законах, судах, адміністрацыйных установах на карысць лацінскай і польскай моў», — канстатаваў М. Гарэцкі [7]. Пры гэтым ён падкрэсліў пазітыўную ролю уніяцкай царквы ў захаванні культурна-моўнай самабытнасці беларускага народа.

---

[5] Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1992. С. 100.

[6] Тамсама.

[7] Тамсама. С. 148.

Драматычныя лёсы беларусаў у мінулым аналізаваў Ігнат Канчэўскі (літ. псеўданім Ігнат Абдзіраловіч) у філасофскім эсэ «Адвечным шляхам» (Вільня, 1921). Галоўная асаблівасць гістарычнага развіцця беларускага народа — гэта «ваганне паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыхільнасць ні да аднаго, ні да другога» [8]. У асобныя перыяды гэтая невыразнасць мела фатальныя наступствы. Аслабленне дзяржаўнасці пачалося з канца XIV ст. «Неакрэсленая палітыка Вітаўта, яго прыхільнасць да польскага шляхецтва, яго нявызначаныя адносіны да беларускіх князёў і народу зрабілі тое, што Беларусь траціць дзяржаўную незалежнасць, [...] магчымасць выказаць свой культурны твар» [9].

Хоць у Заходняй Беларусі не было ўмоў для правядзення фундаментальных навуковых даследаванняў, але асобныя арганізацыі і дзеячы займаліся навуковымі распрацоўкамі ў галіне гісторыі, культуралогіі. Гістарычная секцыя дзейнічала ў Беларускім навуковым таварыстве (1918–1939), мэтай якога была «рознабаковая навуковая праца, развіццё любові да навуковых доследаў і пашырэнне ведаў» [10] БНТ наладзіла ўрачыстыя мерапрыемствы да 400-годдзя беларускага кнігадрукавання (1925), дзе з дакладамі выступалі Адам Станкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, 400-годдзя Статута ВКЛ 1529 г. (1929), — Антон Луцкевіч, Янка Станкевіч, 500-годдзя смерці Вітаўта (1930), выступоўцы — Мікола Ільяшэвіч, Я. Станкевіч і іншыя. З БНТ цесна супрацоўнічаў навуковы гурток студэнтаў-беларусаў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя — Таварыства прыяцеляў беларусаведаў (1931–1939). Гурткоўцы на сходах секцый выступалі з рэфератамі. Асабліва трэба адзначыць святкаванне імі гістарычных юбілеяў — 300-годдзя смерці Л. Сапегі (1933) і іншых.

Члены БНТ удзельнічалі ў міжнародным з'ездзе гісторыкаў у Варшаве, рэгіянальным — у Львове. На VI Агульнапольскім з'ездзе гісторыкаў у Вільні (1935) акрамя А. Луцкевіча выступаў Вінцук Грышкевіч. У сваім дакладзе «Роля беларускіх зямель у польска-літоўскіх уніях» ён паспрабаваў прасачыць станаўленне ВКЛ як поліэтнічнай дзяржавы. Як адзначаў дакладчык, гэты працэс адбываўся ў жорсткай барацьбе літоўскай і беларуска-ўкраінскай

[8] Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду. Мн., 1993. С. 9.

[9] Тамсама. С. 10.

[10] Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства. Кн. 1. Вільня, 1933. С. 5.

(усходнеславянскай) арыстакратыі. Сярод прычын заняпаду ВКЛ адзначалася паланізацыя і акаталічванне «вярхоў», што імкнуліся да новых прывілеяў і вольнасцей. Допуск двух беларускіх даследчыкаў да работы з'езда сведчыў аб імкненні часткі польскай адміністрацыі да палітыкі паразумення з этнічнымі супольнасцямі [11], якія жылі ў паўночна-заходнім рэгіёне тагачаснай Польскай дзяржавы.

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, у 1933 г. удалося выдаць навуковы зборнік «Гадавік Беларускага навуковага таварыства ў Вільні». Вядомыя і недаследаваныя аспекты гісторыі і культуры ВКЛ асвятляліся там у артыкулах Я. Станкевіча «Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом», Міколы Шкялёнка «У трохсотыя ўгодкі смерці Вялікага канцлера Льва Сапегі». Арганізаваць рэгулярнае выданне «Гадавіка» не ўдалося. Навуковыя і навукова-папулярныя публікацыі на гістарычныя тэмы змяшчаліся на старонках заходнебеларускіх часопісаў «Шлях моладзі», «Студэнцкая думка», «Калоссе» і іншых.

Сярод артыкулаў, апублікаваных у 1938 г. на старонках навуковага зборніка «Запісы Беларускага навуковага таварыства», трэба адзначыць «Канец існавання друкарні дому Мамонічаў» Хведара Ільяшэвіча, «Мова дыпламатычнага ліста Рыжскай рады 1271–1280» Я. Станкевіча і іншыя. Навуковай навізной выдзяляўся артыкул М. Шкялёнка «Падзел гісторыі Беларусі на перыяды». Ён падверг крытыцы ўжо прызнаную перыядызацыю У. Ігнатоўскага («назвы перыядаў не адпавядаюць зместу»). Прапанаваў не абмяжоўвацца дзяржаўнай прыналежнасцю. «Трэба браць пераломныя пункты ў жыцці беларускага народу», — заяўляў аўтар [12]. Пры гэтым за аснову перыядызацыі зноў быў узяты агульнадзяржаўны падыход, але ў комплексе з іншымі фактарамі. Традыцыя менавіта беларускай дзяржаўнасці была празмерна абсалютызавана. М. Шкялёнак вылучаў два перыяды незалежнага існавання Беларусі: 1) асобных дзяржаў (княстваў) (IX – сярэдзіна XIII ст.); 2) суцэльнай дзяржаўнасці (сярэдзіна XIII – канец XVII ст.). Не толькі Люблінскую, але і Брэсцкую унію ён ацаніў адмоўна («падарвалі беларускую дзяржаўнасць»). Перыяд заняпаду дзяржаўнасці беларусаў, на думку аўтара,

---

[11] Środowiska historyczne II Rzeczypospolitej: Materiały konferencji naukowej w Krynicy w 1989 roku / Uniwersytet Warszawski, Zakład historii historiografii i dydaktyki historii; Pod red. J. Maternickiego. Cz. IV. Warszawa, 1990. S. 297.

[12] Запісы Беларускага Навуковага Таварыства. Вільня, 1938. Сш. 1. С. 1–9.

пачаўся ў канцы XVII ст. Пры характарыстыцы другога перыяду абвяргаўся тэзіс пра літоўскае заваяванне беларускіх зямель. Знешняя небяспека, хрысціянства, знешнегандлёвыя адносіны прывялі да ўтварэння суцэльнай дзяржавы — ВКЛ. М. Шкялёнак лічыў, што новая дзяржава з'яўлялася беларускай. Гэтым ігнараваўся поліэтнічны, поліканфесійны характар ВКЛ.

Беларускі погляд на згаданую праблематыку прысутнічаў і ў шэрагу іншых даследаванняў. Асобныя працы Я. Станкевіча («Месца беларускага языка сярод іншых славянскіх языкоў і час яго ўзнікнення» (1930), «Час узнікнення беларускага і ўкраінскага народаў» (часопіс «Sprawy Narodowościowe» (1931. № 4–5, 6)) выклікалі навуковую палеміку. А. Луцкевіч надрукаваў у «Беларускім календары на 1929 год» артыкул «Чатырохсотлецце першага кодэксу беларускага права», а ў часопісе «Школа і жыццё» (1930. № 1) — «Статут Вялікага княства Літоўскага на фоне эвалюцыі нацыянальных адносінаў у Беларусі». Некаторыя з яго матэрыялаў застаюцца пакуль яшчэ не апублікаванымі. У адным з яго рукапісаў адлюстравана эвалюцыя дзяржаўнасці Беларусі з глыбокай старажытнасці. Аўтар выступіў супраць сцвярджэнняў, што беларусы не мелі раней сваёй дзяржаўнасці. Гісторыя ВКЛ ім не закраналася, але падкрэслівалася, што «Літва мела шмат супольнага з Беларуссю» [13].

Лідэр беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў А. Станкевіч таксама пачынаў традыцыю дзяржаўнасці Беларусі з Полацкага, Турава-Пінскага княстваў, ВКЛ. «Пасля падзення дынастыі Рагвалодавічаў у XIV ст. пачынаецца аб'яднанне беларускіх княстваў з Літвой, якая сама трапіла пад культурны ўплыў беларускага народа» [14]. А. Станкевіч адмаўляў тэзіс аб літоўскім захопе заходнебеларускіх зямель і іх гвалтоўным далучэнні да Літоўскай дзяржавы ў час станаўлення ВКЛ. У разуменні А. Станкевіча ВКЛ была літоўска-беларускай дзяржавай з некаторымі ўкраінскімі ўплывамі, дзе «палітыку тварылі перадусім літоўцы, а культуру — беларусы» [15]. За ўсходнеславянскім этнічным кампанентам прызнавалася вядучае месца ў духоўным

---

[13] Бібліятэка АН Літвы. Аддз. рукап. Ф. 21, спр. 331, арк. 9.

[14] Дадзеная цытата прыведзена паводле нямецкамоўнага рэферата А. Станкевіча «Беларусы як нацыянальная меншасць Польшчы», які быў выяўлены аўтарам дадзенага даклада ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (Ф. 3, воп. 1, спр. 280, арк. 3–15) і надрукаваны ў беларускім перакладзе (Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 2. С. 109–119).

жыцці ВКЛ. Роля рэлігійных каштоўнасцей у часы Рэчы Паспалітай істотна завышалася ў параўнанні са свецкай культурай[15]. У канцэпцыі гісторыі Беларусі А. Станкевіча сам факт заключэння Люблінскай уніі 1569 г. і яго наступствы для беларускіх зямель атрымалі негатыўную ацэнку — пачатак агульнага заняпаду XVII–XVIII стст.

Ацэнкі А. Станкевічам пачатковай гісторыі Рэчы Паспалітай, ролі рэлігіі ў гэтай дзяржаве не прымаліся ўжо згаданым М. Шкялёнкам. На думку У. Конана, лідэр БХД здолеў упершыню паказаць беларускі вызваленчы рух у прававым і палітычным агульнаеўрапейскім кантэксце[16].

А. Станкевіч даў высокую ацэнку гуманістычнай, дэмакратычнай дзейнасці беларускага асветніка ў брашуры «Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі (1525–1925)» (Вільня, 1925). Пытанне палітычнай гісторыі ВКЛ закраналася ім у працы «Вітаўт Вялікі і беларусы» (1930). Гісторыі асветы прысвечана яго праца «Беларуская мова ў школах Беларусі XVI–XVII ст.» (Вільня, 1928).

Пытанні царкоўных і этнаканфесійных адносін, хрысціянскай духоўнай спадчыны разглядаліся А. Станкевічам у шэрагу свецкіх і рэлігійных прац гісторыка-культурнага зместу — «Родная мова ў святынях» (Вільня, 1929), «У чэсць 950-годдзя хрышчэння Беларусі» (Вільня, 1938) і іншых.

Наогул, традыцыі ВКЛ у заходнебеларускіх гісторыка-культуралагічных працах міжваеннага часу разглядаліся ў агульным рэчышчы нацыянальна-дэмакратычнай гістарыяграфічнай канцэпцыі, рамантычнай па свайму характару. Адсутнасць умоў для фундаментальных даследаванняў тым не менш не перашкодзіла ажыццявіць сур'ёзную пастаноўку ключавых праблем з гісторыі ВКЛ. Заходнебеларускія дзеячы шукалі ў гісторыі беларускага народа эпохі ВКЛ і Рэчы Паспалітай асновы для будучай незалежнасці. Пры гэтым непазбежнай была пэўная гістарычная міфалагізацыя, асобныя памылковыя меркаванні і высновы гісторыкаў, літаратараў, публіцыстаў, непрыняцце выказаных пастулатаў з боку інтэлектуальнай эліты суседніх народаў — спадкаемцаў ВКЛ.

---

[15] Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення: З нагоды 70-леццця смерці Кастуся Каліноўскага, рэд. «Mużyckaj Praudy» (1864) і 50-леццзя «Гоману» (1884). Вільня, 1934. С. 8.

[16] Конан У. Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі. Мн., 2003. С. 42.